# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

***№ 3 (77) ЛІСТАПАД 2021***

**Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно”**



**Нацюрморт**
**вучаніцы 8 «Б» класа**
**Кацярыны Бегуновіч**

**Лістападу радуйся і снежню,**
**І вятрам асеннім і снягам.**
**І малая крыўда здасца смешнай,**
**І як слаўна жыць — адчуеш сам.**

**Гэта ўсё не штучная бадзёрасць,**
**Ісціну адну ты зразумей:**
**Тое, што здаецца нам будзённым,**
**Нібы свята, ўспомніцца пазней.**

***Пімен Панчанка***

## І залатая восень, і перш снег...

Разам з чытачамі нашай газеты мы развітваемся з восенню, якая кожны раз непрадказальная сваім вераснёўскім цяплом і сонейкам, па-кастрычніцку прыгожая і залатая, яна засцілае зямлю сваім убраннем, у лістападзе здзіўляе першым нясмелым і робкім, доўгачаканым сняжком.

Прыгожа пафарбаванае Чараўніцай Восенню лісце пастунова аблятае, засцілаючы зямлю залацістым покрывам. Галінкі дрэў сіратліва пранзаюць паветра. Усё ў чаканні халадоў і маразоў. Пералётныя птушкі развіталіся з намі да наступнай вясны. Дзікія жывёлы назапасілі на ўсю зіму прысмакаў. На душы лёгкі сум і спакой. Восень пастунова перадае свае правы ўладара Зіме, якая першымі нясмелымі сняжынкамі вітае нас. **Бывай, Восень! ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ЗІМА!**

***Герасімава Аліса,***
***вучаніца 5 “В”класа***

# 11 ЛІСТАПАДА - МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЯ

На працягу тыдня сярод вучняў 1-11 класаў нашай школе прайшлі тэматычныя інфармацыйныя гадзіны па тэме **«11 лістапада - Міжнародны дзень энергазберажэння».**



**Пераможцай раённага этапа рэспубліканскага конкурсу “Энергамарафон-2021 ” стала вучаніца 8 “Б” класа Бегуновіч Кацярына.** Работа носіць назву **“Энергосбережение – к ресурсам уважение”.**

На малюнку на фоне касмічнай прасторы можна ўбачыць планету Зямля, на якой знаходзяцца разеткі, да якой ідуць шнуры з відэльцамі, а таксама відэльцы з парасткамі. Такая выява сімвалізуе сабой неабходнасць зберагаць электраэнергію, атрыманую шляхам спальвання арганічнага паліва, а таксама заклікае не пакідаць уключанымі ў сетку электрапрыборы, каб зберагчы прыродныя рэсурсы (драўніну, торф, вугаль і інш.), неабходныя для вытворчасці цеплавой электраэнергетыкі.

Вучні 1-4 класаў прынялі актыўны ўдзел у конкурсе малюнкаў **"Энергазберажэнне вачыма дзяцей".** Кожная творчая праца - эта заклік дзяцей да неабходнасці ашчаднага выкарыстання энергіі, электрычнасці.

Акрамя таго, вучні ўстановы адукацыі наведалі выставу **«Адкрый планету Беражлівасць».** Інфамацыя пра неабходнасць энергазберажэння была пададзена на выставе ў сур’ёзнай форме і з гумарам, а таксама ў лёгкай гульнёвай форме: дзеці адгадвалі загадкі, працягвалі вядомыя прыказкі і прымаўкі на тэму, а таксама яны даведаліся пра літаратурных герояў, якія былі празмерна ашчадныя і занадта беражлівыя, адказалі на пытанні тэста і праверылі па гараскопу, які знак задыяка самы ашчадны.





Між іншым, **з лістапада па снежань 2021 г.**
у нашай школе праходзіць **акцыя**
**па зборы макулатуры “ПАПЯРОВЫ БУМ”.**
**Мы заклікаем кожнага прыняць удзел у ёй, сабраць макулатуру і тым самым захаваць дрэвы ад вырубкі!**



# ЗАХАВАЙЦЕ СЯБЕ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ!

З 22 па 27 лістапада ў нашай школе праходзіла **прафілактычная акцыя "Захавай сябе для жыцця",** накіраваная на прафілактыку ўжывання алкаголю, наркатычных і псіхатропных рэчываў, курыльных сумесей сярод непаўналетніх.




Для вучняў былі праведзнеы шматлікія мерапрыемствы: хвіліны бяспекі "**Разам супраць наркотыкаў**" з праглядам відэаролікаў "Зрабі правільны выбар!", "Думаў, ніколі не траплю..."сярод вучняў 9-11 класаў. 10-я класы прынялі ўдзел у **маладзёжнай акцыі "Спынім СНІД разам", прымеркаванай да Сусветнага дня барацьбы са СНІДам.** Пачатковыя класы сталі ўдзельнікамі гутаркі **"Курэнне - галоўны вораг здароўя".**






**На сайце нашай установы змешчаны відэаролікі, якія ў даступнай форме апавядаюць пра цяжкія наступствы ўжывання наркотыкаў, адказнасць за іх распаўсюджванне. Убачыць ролікі можна праз выкарыстанне QR–кода.**

# АДМЕТНЫЯ ФАКТЫ І ПАДЗЕІ

12 лістапада вучні нашай школы прынялі ўдзел **у дыялогавай пляцоўцы па патрыятычным выхаванні моладзі,** якая прайшла ў Бярэзінскім раённым цэнтры культуры. Рабят не пакінула абыякавымі тэма "Што значыць сёння быць патрыётам?" і якія якасці трэба выхоўваць у сабе, каб стаць сапраўдным патрыётам сваёй краіны.






26 лістапада ў нашай школе ў рамках прафілактычнай работы па папярэджанні палавой недатыкальнасці адбылася **сустрэча дзяўчат 9-11 класаў з урачом псіхіятрам псіхатэрапеўтам УАЗ "Бярэзінская ЦРБ" Казлоўскім Дзмітрыем Станіслававічам на тэму: “Пагаварым пра патаемнае”.** У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся пытанні дапамогі выхаду з крызісных жыццёвых сітуацый, правільнага выбудоўвання адносін з аднагодкамі, бацькамі. Дзмітрый Станіслававіч адказаў на пытанні, якія цікавяць, даў індывідуальныя рэкамендацыі дзяўчатам. У далейшым такія сустрэчы стануць традыцыйнымі.





**7 лютага 2021 г. пайшоў з жыцця Мікалай Канстанцінаваіч Казакевіч, мастак, член Беларускага саюза мастакоў, заслужаны дзеяч мастацтваў, наш зямляк.**



**Мікалай Канстанцінавіч нарадзіўся 5 мая 1934 года ў вёсцы Дулебы Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці.** Дзяцінства прыйшлося на цяжкія ваенныя і пасляваенныя гады. Неўзабаве пасля пачатку вайны памёр бацька, а праз некаторы час звар'яцелыя карнікі закатавалі і спалілі маці разам з хатай. Засталося шасцёра дзяцей, якія разам з іншымі жыхарамі вёскі хаваліся ў лесе, потым жылі ў партызанскім атрадзе. З 1945 па 1950 г. – выхаванец Бярэзінскага дзіцячага дома.

Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1955), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1961). Вучыўся ў Віталя Цвіркі, Анатоля Шаўчэнкі, Уладзіміра Сухаверхава, Аляксандра Мазалёва. Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах лірычнага пейзажа, фігуратыўнай карціны. Жыў у Гомелі.

У пэўным сэнсе Мікалая Казакевіча можна назваць адным з заснавальнікаў гомельскай школы жывапісу, які вызначаецца светлым, радасным успрыманнем жыцця, чысцінёй і яркасцю фарбаў. У сваёй творчасці мастак сцвярджае прыгажосць штодзённасці, адзінства чалавека і навакольнага асяроддзя.

У **карціне «Над роднымі прасторамі»** Мікалай Казакевіч стварыў гімн самай лепшай і бесклапотнай пары чалавечага жыцця – дзяцінству. Мастак па-майстэрску перадаў рухомасць сонечнага святла, а ўзаемапранікненне фарбаў на палатне ствараюць адчуванне растваральнай прасторы ў зыбкай празрыстасці паветра.





У час адной гутарцы з журналістамі Мікалай Казакевіч прызнаўся, што самая любімая яго карціна - **"Юнацтва"** знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея рэспублікі. Падзяліўся мастак **крыніцай свайго аптымізму: “Сакрэт просты – люблю неба, фарбы, прыроду і ўвогуле жыццё. Я ведаю цяжкія часы, вайну - бо дзяцінства прайшло ў партызанскім раёне. Але на ваенную тэматыку напісаў усяго адну працу. Мяне натхняюць мір, жыццё, колер”.**

# 200 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ РУСКАГА ПІСЬМЕННІКАМ ФЁДАРА МІХАЙЛАВІЧА ДАСТАЕЎСКАГА



## УЗГАДАЕМ 5 ЦІКАВЫХ ФАКТАЎ З ЖЫЦЦЯ КЛАСІКА

Па лініі бацькі пісьменнік паходзіў са шляхецкага роду Дастаеўскіх. Родапачынальнікам лічыўся баярын Данііл Ірцішчаў. Ён набыў **вёску Дастоева ў беларускім Палессі,** ад яе назвы і адбылося прозвішча пісьменніка.

Дастаеўскі накіроўваўся ў Омскі астрог праз Табольск. Тут ён сустрэўся **з жонкамі сасланых дзекабрыстаў,** якія падарылі петрашэўцам **Евангелле** – адзіную кнігу, якая была дазволена ў астрозе. Дастаеўскі не раставаўся з ёй усё жыццё. Сёння кніга захоўваецца ў музеі-кватэры пісьменніка ў Маскве.

**«Смяротнае пакаранне расстраляннем».** Так гучаў прысуд, які Ваенна-судная камісія вынесла Дастаеўскаму па «справе петрашэўцаў». Пісьменнік патрапіў у гурток Петрашэўскага ў канцы 1840-х гадоў. Тут абмяркоўвалі многія надзённыя пытанні: адмену прыгоннага права, свабоду друку, рэформы. Фёдар Дастаеўскі быў арыштаваны за публічнае прачытанне забароненага ліста Бялінскага. Пра тое, што пакаранне будзе інсцэніроўкай, а арыштанты адправяцца на катаржныя працы, асуджаным аб'явілі ў самы апошні момант. Пачуцці чалавека, прысуджанага да смерці, Фёдар Дастаеўскі пазней адлюстраваў у рамане **"Ідыёт".**

Дастаеўскі захоплена працаваў над раманам **"Злачынства і пакаранне",** калі ўспомніў аб сваіх абавязках па ўмовах дамовы прадставіць новы раман да 1 лістапада 1866 гады. Пры парушэнні дамовы выдавец атрымліваў права публікаваць усе творы пісьменніка бясплатна 9 гадоў. Пісьменнік наняў прафесійную стэнаграфістку **Ганну Сніткіну.** Выкарыстоўваючы свае напрацоўкі ад паездкі за мяжу, ён з 4 па 29 кастрычніка прадыктаваў ёй тэкст новага рамана **"Ігрок".** Твор здалі ў тэрмін, а праз тыдзень пасля гэтага Дастаеўскі зрабіў прапанову Ганне Сніткінай, якая была на 25 гадоў маладзейшая за пісьменніка.

**Вялікае пяцікніжжа** – такая назва дадзена неафіцыйнаму цыклу з пяці самых маштабных раманаў рускага класіка. Яны былі напісаны адзін за адным і як бы ўяўляюць з сябе раманны марафон геніяльнага празаіка. У пяцікніжжа ўваходзяць: **"Злачынства і пакаранне", "Ідыёт", "Бясы", "Падлетак" і "Браты Карамазавы".** У самой назве прасочваецца **сувязь з "Пяцікніжжам Майсея"** – пяці першых кніг Бібліі яўрэяў і хрысціян. Майсею тэкст яго працы прадыктаваў сам Бог. Талент Дастаеўскага такі вялікі, што цяжка ўявіць, быццам яго кнігі напісаны чалавекам, здаецца, яны таксама надыктаваныя нейкай боскай сутнасцю.







**Спецыяльна да юбілейнай даты ў лістападзе** ў нашай школе былі арганізаваны тэматычныя мерапрыемствы: інфармацыйныя хвіліны **«200 гадоў Дастаеўскаму»,** прагляд фільма «Сваім голасам», вечар-партрэт **«Знаёмцеся, Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі»,** прысвечаныя вядомаму рускаму пісьменніку, яго жыццю і творчасці, у бібліятэцы арганізавана выстаўка **«Па старонках кніг вялікага майстра слова",** праведзены відэаконкурс **«Чытаем Дастаеўскага».**



Эсэ пад назвай "Жыццё як бясцэнны дар" вучаніцы нашай школы **ЯНЫ МОРСКАЙ сёлета было** адзначана **дыпломам 2 ступені на раённым этапе конкурсу творчай моладзі "Залатое пяро Белай Русі"**. Прапануем нашым чытачам пазнаёміцца з ім!

## ЖИЗНЬ КАК БЕСЦЕННЫЙ ДАР

Самая большая ценность для меня – это моя семья и дорогие мне люди. Родители, близкие и родные – это люди, любящие тебя без каких-либо условий, поддерживающие, понимающие, готовые пожертвовать всем, если потребуется для твоего счастья. Я это чувствую и стараюсь своей любовью, вниманием, помощью, пусть и маленькой, воздать им за все, за жизнь, данную мне.

**Семья – это самое важное в жизни каждого человека.** Думаю, так считают многие, кто родился в любящей семье, кому посчастливилось вырасти в теплом семейном кругу. Так понимать ценность семьи, гармоничных отношений внутри нее может человек независимо от места проживания, религии, политических взглядов. И значит семья – это общечеловеческая ценность, которая объединяет меня и думающего также, как и я, человека, даже совершенно незнакомого мне.

**Самое страшное на земле – это война. И самое глупое, что есть на земле, – это война.** Я уверена, нельзя построить что-то хорошее разрушая, уничтожая человеческие жизни. Не причинить зла другому, поступать с другими людьми так, как хочешь, чтобы люди поступали с тобой, – истина, формула, руководствоваться которой должен человек, принимая ответственные решения за судьбы людей.

Причин и поводов для войны может быть много. Но есть одна против – жизнь человека, ребенка. **Жизнь – самая великая ценность на земле.** Она дана человеку свыше, это подарок, и никто не вправе отнимать её. Раскаяние, осуждение и наказание для тех, кто развязывает войну, думаю, неизбежно. Ведь как бывает: кто приходит с мечом, может от меча и погибнуть.

Поэтому **самое важное – это необходимость сохранения мира**, умение договориваться, выстраивать диалог, без опрометчивых действий и необдуманных поступков. **Сохранить жизнь человека во что бы то не стало** – главное, чем должен руководствоваться каждый здравомыслящий человек. Если вам кажется, что человек не прав, думает не так, как вы, – нужно искать компромисс, не силой, но словом отстаивать свою позицию, привести тысячи аргументов в подтверждение своего мнения и обязательно уметь выслушать оппонента.

**Ценностью для меня, как и для многих людей, живущих на планете, является родина** – то место, где мы выросли. Моя малая родина – Березино. Это небольшой город в 100 километрах от столицы. Издавна, окруженный лесами, полными дичи, у красавицы-реки Березины, город был местом мирного проживания людей разных национальностей и разного вероисповедания. В начале XX века преимущественно здесь жили евреи, торговцы и ремесленники, действовали синагоги, библиотека.

*Працяг на ст. 8*

Однако судьба представителей этой национальности в Березино была трагична. В годы Великой Отечественной войны было образовано гетто, зимой 1942 года более 900 ни в чем неповинных людей были уничтожены. Сегодня на месте жестокой и варварской расправы стоит памятник. Главным свидетельством жизни татар в Березино стали несколько уцелевших памятных камней на месте мизара. Несколько лет назад татарское кладбище было облагорожено местным предпринимателем как дань уважения истории родного города.

Сегодня в городе действуют православный храм и католический костел. Мирное сосуществование людей разных национальностей и вероисповеданий, на мой взгляд, коренится в подлинном человеколюбии, уважении к другому. **Любовь, всеобъемлющая, всепрощающая, – основа жизни на земле.** Как тут не вспомнить строки Евгении Янищиц «Пачынаецца ўсё з любві». И это не только о любви двух людей, одиноких странников, встретившихся по воле судьбы, это вообще о любви к родному дому, к земле, которая вскормила тебя, о любви к делу, которому ты служишь, это о любви, взаимопонимании и поддержке, которая царит в семье, где люди счастливы. Любовь – это право, которое дается каждому человеку, и он должен воспользоваться им.

Я вижу мир глазами шестнадцатилетней девчонки. Читаю, люблю уроки литературы и истории. С удовольствием занимаюсь в городской студии танца, выступаю на сцене. Для меня это радость, возможность дарить зрителям тепло своего сердца, зажигать в них желание жить и улыбаться. Я счастлива, ведь все, что я говорю и делаю, находиться в гармонии со мной. Поступать так всегда, сохраняя внутренний баланс, – это ценность, понимание этого – мой сосуд, драгоценный. Поэтому **нужно жить, находясь в гармонии с собой, не причиняя боль другому человеку, не ущемляя его прав и свобод, уважая его право голоса, считаясь с мнением других.**

Что там за новым поворотом – неизвестно, ведь я только начинаю свой путь во взрослую жизнь. Однако мое понимание того, что есть мир, родина, любовь, счастье и гармония позволит мне навсегда остаться человеком, порядочным и благородным, не способным предать, унизить, лицемерить, разрушать, а только созидать, приносить счастье, тепло и добро людям, которым это нужно. Может быть, это слишком пафосно, громко звучит, но я так чувствую. Я просто так дышу и живу, стараясь оставаться человеком, принимая **жизнь как бесценный дар**, и это, надеюсь, объединяет меня со многими другими людьми, живущими в нашей стране, на этой планете.

***Яна Морская***

ДУА "Сярэдняя школа №2 г. Беразіно" 223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
https://berezino2.schools.by/

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба "Юны журналіст": Верас Анастасія, Камароўская Ксенія, Мікуцкая Ліза, Сіняк Вікторыя, Швед Анастасія, Чыстап'ян Ульяна, Хасіневіч Марыя і інш.
Рэд. А.Я.Ждановіч